**Н. В. ЗАЯЦ (МІНСК, БЕЛАРУСЬ)**

# М. ЗАРЭЦКІ Ў ШКОЛЕ: ІДЭЙНЫ ЗМЕСТ АПАВЯДАННЯЎ “ВОРАГІ” І “КВЕТКА ПАЖОЎКЛАЯ”

У X класе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі на ўроках беларускай літаратуры адбываецца знаёмства з творчасцю аднаго з самых папулярных у 1920–1930-я гг. празаікаў М. Зарэцкага. Базавы ўзровень прадугледжвае вывучэнне апавядання “Ворагі”, павышаны – апавяданняў “Ворагі” і “Кветка пажоўклая”, якія выяўляюць мастацкую спецыфіку “малой” прозы пісьменніка, ілюструюць адметнасць яго стылю. У матэрыяле раскрыты ідэйны змест твораў, пазначаны накірункі іх праблемнага разгляду на занятках.

У апавяданні “Ворагі” (1923) знаходзіць мастацкае ўвасабленне тэма драматычнага лёсу “былых”, “учарашніх” (азначэнне М. Мушынскага) – адна з галоўных у творчасці М. Зарэцкага. Сутыкненне новага і старога паказана праз узаемадачыненні чэкіста Гуторскага і дачкі памешчыка Ніны Купрыянавай. Метафарай для ўвасаблення свету “былых” з’яўляецца вобраз “*пажоўклых, адарваных ад дрэва лістоў*”. Гэта метафара неаднаразова ўзнікае ў творы і дазваляе перадаць ідэю пра быццам бы натуральнасць ходу рэвалюцыі і неабходнасць знішчэння ўсяго старога дзеля цудоўнай будучыні: “*Тады ўжо не будзе гэтых адсклёпкаў, гэтых пажоўклых лістоў старога, гнілога, забуранага навальніцай дрэва... Пацьмеюць, пагніюць, спарахнеюць, знікнуць, як дым пад павевам свежага ветру...*” [1, с. 152].

Гуторскі лічыць сябе змагаром за рэвалюцыйныя ідэалы: высочвае нязгодных з новай уладай і распраўляецца з імі, каб не заміналі лепшаму жыццю народа. Гуторскі – выхадзец з вёскі, а таму павінен добра ведаць праблемы бедакоў і дзейнічаць у імя іх інтарэсаў. Аднак падчас адной з паездак чэкіст заходзіць у вясковую хату і ловіць сябе на думцы, што адчувае агіду і непрыязнасць да такога асяродку. “*Што ж гэта? Няўжо я так далёка адышоўся ад сялянскага жыцця? Няўжо я настолькі абынтэлігенціўся, апанеў?*” [1, с. 120]. Гэтым эпізодам пісьменнік засведчыў агульную грамадскую тэндэнцыю: дзейнасць Гуторскага і яму падобных становіцца самамэтнай, страчвае рэальны падмурак, сувязь з тымі, у імя каго яна ажыццяўляецца, пазбаўляецца духоўна-гуманістычнага складніку. Мімалётная згадка пра бацьку, з якім не бачыўся пяць гадоў (не давала праца ці не было жадання?), дадае важную рысу ў псіхалагічны партрэт Гуторскага, выяўляе яго прыярытэты.

“Ворагам” новага ладу з’яўляецца Ніна Купрыянава, аднак яе вобраз выклікае сімпатыю, суперажыванне і шкадаванне. У гэтым бачыцца чалавечая смеласць і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пісьменніцкая сталасць М. Зарэцкага: “Ва ўмовах, калі ідэя класавай барацьбы, ідэя класавага падыходу ўсё больш актыўна навязвалася грамадству, абарона пісьменнікам “былых”, “учарашніх”, яго заклік праявіць спагадлівасць, міласэрнасць, дабрыню да пераможаных нейтралізавалі гэтую небяспечную ідэю. Сваімі апавяданнямі М. Зарэцкі ўмацоўваў аўтарытэт беларускай літаратуры як мастацтва гуманістычнай скіраванасці” [2, с. 507], – адзначыў М. Мушынскі.

Ніне даводзіцца зрабіць надзвычай складаны выбар, які ў любым выпадку не прадугледжвае шчаслівага вырашэння сітуацыі. Выратоўваючы бацьку ад расстрэлу, Ніна выдае чэкістам свайго каханага, фактычна сама забівае самага дарагога чалавека.

На вобразах Ніны і Гуторскага пісьменнік ажыццяўляе і мастацкае даследаванне праблемы “бацькі і дзеці”. Гэта традыцыйнае для літаратуры пытанне разглядаецца не як канфлікт пакаленняў, а як канфлікт ідэй і каштоўнасцей, канфлікт грамадскага і асабістага. У Гуторскага сыноўнія пачуцці атрафіраваліся, выцесніліся партыйнай ідэалогіяй. Яму не зразумелыя пакутлівыя роздумы Ніны пра межы “*кроўнага пачуцця*”, перад ім не паўстае дылемы “*страціць бацьку*” ці “*адмовіцца ад <...> справы*”: “*Я б, вядома, не задумаўся...*” [1, с. 140], – без ваганняў заяўляе ён.

М. Зарэцкі з псіхалагічнай дакладнасцю перадае душэўныя хістанні Ніны, для чаго задзейнічае партрэтную характарыстыку. Так, у першую сустрэчу дзяўчына з’яўляецца перад Гуторскім “*сталай, спелай красуняй, прыгожай, вабнай*” [1, с. 122]. Пасля зробленага выбару яе цяжка пазнаць, “*так змянілася яна. Схудзела, счарнела, вочы праваліліся глыбока-глыбока, глядзяць стуль неяк дзіўна-напружана, гарачь ліхаманкавым аганьком і быццам шукаюць чагось*” [1, с. 130].

Лінія кахання “ворагаў” надае твору дынамізм, інтрыгуе чытача, завастрае ўзнятыя праблемы. У апавяданні рэалізуецца схема любоўнага трохкутніка, што яшчэ больш драматызуе дзеянне: Ніна кахае Зарубу, але ахвяруе ім; Гуторскі кахае Ніну, аднак яны не могуць быць разам. Дзесяць год назад чэкіст захапляўся паненкай Купрыянавай, адчуваў да яе юначае чыстае пачуццё. Пры сустрэчы яно ажыло, але і тут для Гуторскага грамадскае важней за асабістае: “*Яму хацелася кінуцца да яе, схапіць у абдымкі, цалаваць... <....> А розум гаварыў іншае. Розум бачыў перад сабой ворага, злоснага класавага ворага*” [1, с. 125]. Тым не менш чэкіст, здаецца, гатовы пасту піцца грамадскімі ідэаламі на карысць кахання – нават хоча ажаніцца з Нінай, але яна адмаўляецца ад прапановы: “*Нічога не выйдзе з гэтага. Толькі папсуём жыццё адзін аднаму, згубім сябе... Мы – ворагі...*” [1, с. 150]. Невыпадкова тое, што прызнанне адбылося восенню: “*...Жоўтым дажджом сыпаліся з дрэў лісты, дываном засцілалі*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*чорную згалелую зямлю. У паветры дрыгацеў сум адцвітання, сум надыходзячай смерці...*” [1, с. 149–150]. Пейзажная замалёўка стварае адпаведны настрой, дапамагае выявіць думку пра бесперспектыўнасць узаемаадносін герояў. Адмову “закаханы” прымае з палёгкай. “*Гэткі закон жыцця... бязлітасны закон... Усё старое вымятаецца, выкідаецца, як непатрэбнае смяццё. Расчышчаецца дарога новаму...*” [1, с. 152], – запэўнівае сябе разамлелы і супакоены Гуторскі, едучы ў цягніку ў Чырвоную Армію. Ён думае пра неабходнасць павярнуцца да каранёў, да народа, каб не стаць такім непатрэбным “адсклёпкам” жыцця, як Купрыянава. У фінале твора бачыцца сімвалічны сэнс: цягнік рэвалюцыі імчыць Гуторскага наперад да новага жыцця, пакідаючы “*пажоўклыя, адарваныя ад дрэва лісты*” як непатрэбнае смецце.

У апавяданні “Кветка пажоўклая” (1926) аўтар нібы палемізуе з “Ворагамі”: аказваецца, “адсклёпкамі” жыцця могуць стаць і апантаныя рэвалюцыянеры, шчыра адданыя новым ідэалам. Галоўная гераіня Марына Гарнова, загадчыца дзіцячага дома, яшчэ даволі маладая і прывабная жанчына, прыцягвае партыйца Алеся Булановіча дзіўнымі паводзінамі. Для перадачы зменлівасці настрою, псіхалагічнай няўстойлівасці Марыны аўтар выкарыстоўвае мастацкую дэталь: акцэнтуе ўвагу на яе вачах. Яны то “*блішчаць маладым захапленнем*” і зіхацяць “*гарэзным агеньчыкам*”, то ў іх свеціцца “*нешта такое, што падобна было да сполаху або да нейкай палкай, балючай журбы*”, то гараць “*аганькамі гневу*”, то патухаюць “*халоднай, сухой пустатой*”... Увага на вачах дазваляе паказаць складанасць натуры гераіні, яе перажыванні і ўнутраную барацьбу. У апавяданні “Ворагі” мастацкай дэталлю паўстае элемент пейзажу – вобраз пажоўклых лістоў: прадстаўнікі “былога”, дарэвалюцыйнага свету Купрыянавы і Заруба павінны знікнуць з новага жыцця, як пажоўклыя лісты старога дрэва. У колеравай гаме абодвух твораў дамінуе жоўты: ападаюць апошнія восеньскія лісты – апошнія дні дажывае восеньская кветка, “*якая жоўкне сярод сухога былля і яшчэ песціць погляд сваім астатнім сумным харастввом*” [1, с. 332]. Дзякуючы гэтым дэталям узнікае аналогія паміж восенню, часам памірання прыроды, і трагічным лёсам галоўных гераінь.

Дзіўныя паводзіны Марыны Гарновай псіхалагічна матываваныя і крыюцца ў нядаўнім мінулым. Раней жанчына была чэкісткай “*з пільным вокам і сталёвай цвёрдасцю*” (як і Гуторскі з апавядання “Ворагі”). Яна ўцякла з дома бацькі-памешчыка і далучылася да чырвонаармейцаў. “*Я тады пачула тую магутную волю калектыву, аб якой я калісь табе гаварыла. Я злілася з ёй, у ёй растапілася, працялася наскрозь агульнай сталёвай думкай, агульным бурлівым пачуццём...*” [1, с. 338]. Паваротным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

момантам у пераходзе ад калектыўнай эйфарыі да маральнага руйнавання асобы, адчування стомленасці жыццём і адзіноты сярод людзей стаў ліст-праклён, атрыманы ад бацькі пасля таго, як яна падпісала смяротны прысуд брату. Тэма ворагаў гучыць і ў гэтым апавяданні, аднак тут імі з'яўляюцца не прадстаўнікі розных сацыяльных слаёў, а родныя людзі ("*Але гэта быў брат, а ў той час нікога я не лічыла такімі ворагамі, як сваю радню...*" [1, с. 339]). Цяпер Марына знаходзіць кароткае збавенне толькі ў партыйных сходках, дзе, па яе словах, "*чалавек разбаўляецца ў масе, губляе сябе, забываецца на сваё асабістае і жыве, поўніцца гэтым агульным уздымам*" [1, с. 326], ці ненадоўга забываецца ў каханні.

Арыгінальна раскрываецца ў творы тэма кахання. Парадаксальна, але ў любоўным трохкутніку "Гарнова – Аронччык – Булановіч" месца каханню няма. Гарнова прымае за яго імкненне забыцца, уцячы да рэчаіснасці; Аронччык – хваравітую прывязанасць да моцнай і неардынарнай жанчыны; Булановіч – цікаўнасць і жаданне акунуцца ў "*нейкі асобны, дзіўны свет, у якім ён чужы і яму ўсе чужыя*" [1, с. 332]. Нават у апошнюю ноч Булановіч выяўляе сваё маладушша і працягвае чакаць, "*чым гэта кончыцца ўсё*". Раніцай ён без сумненняў ідзе на чыгунку, бо ведае, як Марына павінна была звесці рахункі з жыццём, а пасля яе самагубства адчувае задавальненне і лёгкасць. Як і ў "Ворагах", у фінале твора ўзнікае вобраз цягніка – пад яго коламі гіне Марына Гарнова. У гэтай сувязі актуалізуецца гуманістычная думка пра сапраўдную сутнасць рэвалюцыі, згубнай як для "ворагаў" і "ўчарашніх", так і для "новых" людзей, яе прыхільнікаў і здзяйсняльнікаў.

У абодвух творах яскрава выяўляюццца асноўныя ідэйна-мастацкія характарыстыкі прозы М. Зарэцкага: цікавасць да маральна-этычнай праблематыкі; востры дынамічны сюжэт, драматычны і нават трагічны фінал; псіхалагічная дакладнасць у абмалёўцы персанажаў; выкарыстанне рамантычна-ўзрушанага стылю аповеду і інш. Вывучэнне апавяданняў "Ворагі" і "Кветка пажоўклая" дае магчымасць сфарміраваць у дзесяцікласнікаў уяўленне аб творчасці таленавітага пісьменніка-гуманіста і псіхолага, майстра напружанага сюжэта і мастацкай дэталі М. Зарэцкага.

Літаратура

1. Зарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Зарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1989–1992. – Т. 1 : Апавяданні ; прадм. М. Мушынскага. – 1989. – 526 с.
2. Мушынскі, М. І. Міхась Зарэцкі / М. І. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2014. – Т. 2 : 1921–1941. – 2002. – С. 504–548.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ